**Доўнар А.Б.**

# ДЭКРЭТ 1571 г. ПА СПРАВЕ ВІЦЕБСКІХ МЯШЧАН З ВІЦЕБСКІМ ВАЯВОДАЙ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА

30 мая 1571 г. у Варшаве кароль польскі вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст разгледзеў скаргу віцебскіх мяшчан на віцебскага ваяводу [4]. У манарха пад час разгляда скаргі віцебскіх мяшчан прадстаўляў «воит места Витебъского» Сцяпан (Стэфан) Цімафеевіч Лускіна* і віцебскія мяшчане Тарас Грышыч і Сідар Міцяевіч «сами от себе и ото всего посполства места Витебъского». Яны скардзіліся на віцебскага ваяводу Станіслава Мікалаевіча Паца (які віцебскім ваяводам быў з 1566 г. [6]) аб «великие кривды и утиски а нарушене праву их»«над волности и прывиля ихъ имъ мещаномъ витебским» наданых вялікімі князямі літоўскімі [4, арк. 9 адв.]. Для аргументацыі сваей праваты мяшчане клалі гарадскія прывілеі.

Асноўныя палажэнні дэкрэту па дадзенай справай былі ўведзены ў навуковае абарачэнне беларускім даследчыкам М. Макаравым [2, с. 86–87, 89–90, 123]. Разам з тым, судовы дэкрэт 30 мая 1571 г. прадстаўляе цікавасць для падрабязнага разгляду. Дэкрэт з'яўляецца важнай крыніцай па гісторыі горада Віцебска, яго грамадска-палітычнаму і эканамічнаму стану ў XVI ст.

Скарга віцебскіх мяшчан датычылася 9 пунктаў: 1) удзелу мяшчан у ваяводскім судзе; 2) турэмнага зняволення мяшчан у замкавай турме; 3) раздачы ваяводам гарадскіх зямель; 4) распараджэння вымарачнай маёмасцю мяшчан; 5) атрымання дазволаў ад ваяводы на паездкі мяшчан для ажыццяўлення гандлёвай дзейнасці; 6) узымання памернага ў Віцебску; 7) павіннасцяў гарадскіх рэзнікаў на карысць ваяводы; 8) выканання падводнай павіннасці мяшчанамі; 9) грабяжоў адміністрацыяй ваяводы мяшчан і гарадскіх сёл. Як бачна, скаргі датычыліся як прававога, так і эканамічнага становішча мяшчан у Віцебску. Дэкрэт захаваў не толькі рашэнні вялікага князя літоўскага, але і пункт позірку на праблему як віцебскіх мяшчан, так і ваяводы.

1. Так, па меркаванню віцебскіх мяшчан «воит и мещане старшие витебъские з давных и з вечистых часовъ водлугъ правъ и привилевъ имъ от продковъ наших и от насъ г(о)сп(о)д(а)ра наданых въ замъку на судех всяких справъ восполок з воеводами и наместниками их на месцах своих звыклых седали и пересуды, от кожъдых речеи сужоных приходячие, по некоторои части бирали», а ваявода «им местца ихъ забароняет и пересуду, што имъ водле стародавного звычаю прихоживало не дает». Ваявода са свайго боку сцвярджаў, што не забараняў («не боронил») войту і старэйшым віцебскім мяшчанам удзельнічаць у судзе і не перашкаджаў передачы ім іх часткі перасуда. У сувязі з чым манарх пакінуў тое паводле даўняга звычаю і гарадскіх прывілеяў і забараніў ваяводзе, яго наменікам «воиту и мещаном витебским местъца в судох замъковых звыклого забороняти, такъ же и в пересудохъ в части ихъ, што на нихъ приходить, не мают их заделяти» [4, арк. 10, 11].

Факт удзелу мяшчан у Віцебскім замкавым (ваяводскім) судзе у XVI ст. добра вядомы ў гістарыяграфіі [1; 2, с. 123; 3, с. 166; 5]. Інфармацыя ж дадзенага гаспадарскага дэкрэту сведчыць, што прадстаўнікі кіравання горада – войт са старэйшымі мяшчанамі – ўдзельнічалі з правам рашаючага голаса ў віцебскіх замкавых судах, мелі там замацаваныя за імі месцы. На права паўнавартаснага ўдзелу ў ваяводскім судзе з правам голаса ўказвае факт выдзялення мяшчанам часткі судовых перасудаў. Пры чым, фраза са скаргі, што цяпер ваявода таго «не дает», указвае на механізм выплаты мяшчанам іх часткі перасуду – ваявода збіраў перасуд, а пасля з агульнай сумы выдаваў мяшчанам іх частку.

Праўда, пакуль застаюцца не вырашанымі пэўныя пытанні гэтага ўдзелу: на якіх канкрэтна справах віцебскія мяшчане мелі права прысутнічаць – на ўсіх, ці толькі ў справах з удзелам віцебскіх мяшчан; ці было абавязковым прысутнасць мяшчан-суддзяў ва ўсіх справах з удзелам мяшчан; як вызначаўся і які быў памер той часткі перасудаў, якая ішла на карысць суддзяў ад горада, г.зн. горада?

2. У адной скарзе мяшчане сцвярджалі, што ў выпадку разгляду справы аднаго віцебскага мешчаніна з другім ваявода «виноватого не узнавши и правом не поконавши, до везенья за-

* Лускіна Сцяпан (Стэфан) Цімафеевіч – стаў віцебскім войтам па прывілею караля польскага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста ад 8 снежня 1557 г. (перад гэтым С. Лускіну выбралі войтам віцебскія мяшчане, а віцебскі ваявода Стэфан Збаражскі згадзіся з гэтым выбарам). Быў войтам да 20 чэрвеня 1580 г. [2, с. 120; 3а, с. 160–161].

мъкового, а не до местского, водле права их, сажати кажеть» [4, арк. 10]. Сама скарга сведчыць, што мяшчан не задавальняе факт, калі ваявода садзіў у замкавую турму мяшчан па справах мешчаніна з мешчанінам. Але нічога не гаворыцца пра такую ж незадаволенасць у выпадку заключэння ў замкавую турму віцебскіх мяшчан у справах мяшчан з немяшчанамі: духавенствам, шляхтай, сялянамі. Лагічна выказаць здагадку, што ваявода ў справах мяшчан з немяшчанамі меў права заключэння мяшчан у замкавую турму. Нажаль, дэкрэт 1571 г. не ўтрымлівае інфармацыі аб спрэчках бакоў па скарзе, а проста канстатуе што «где бы ся трафило одному на другого мещанину витебъскому о якую жъ колвекъ речъ жаловати воеводе витебъские, винъного не узнавъшы и правом не поконавши, до везенья замкового сажати не мають; а хотя бы хто и з справавъ якои речи виненъ зосталъ. А где бы поручниковъ по особе мещанъ витебскихъ двух або трох ч(е)л(о)в(е)ковъ, людеи добрих и там оселых, давалъ, такового на рукоемство воеводе витебские мають пущати» [4, арк. 10 адв.].

3. Пытанне правамоцнасці раздачы ваяводам гарадскіх зямель узнікла ў сувязі з надзяленнем ваяводам каралеўскага ротмістра Валента Каменскага чатырма службамі людзей віцебскіх мяшчан (да гэтага гэтымі службамі валодалі наступныя мяшчане: Жарскай службай – Павел Радка і Сцяпан з патужнікамі; Талочынскай службай – Дмітро Стрыка з патужнікамі: службай Зайцавы Настыр – Піліп і Гаўрыла з патужнікамі; службай на Палозях Мытшынскае – Пётр Ескевіч з патужнікамі). Пры разглядзе справы высветлілася, што згодна прывілеяў ні манарх, ні ваявода «отчизнъ и выслугъ… в мещанъ витебских отнимати, ими даритися» не мелі права. Акрамя гэтага сам ваявода прызнаў, што дадзеная раздача была зроблена «в неведомости» гарадскіх прывілеяў, а калі ён даведаўся пра дадзеныя правы мяшчан, то адразу ў 1570 г. «опят тую чотыри служъбы людеи местских ку месту Витебъскому привернулъ» (а ротмістру В. Каменскаму была дадзена эквівалентная замена). Таму «в том артыкуле жалобы воита и мещан витебских, мовеня и сознанья пана воеводина выслухавши и водлугъ привилев местских, обачаючи, же воевода их отдавати не могъ», манарх «тых мещан, грунты их» пакінуў «водле стародавного обычаю и привилевъ их». Мяшчане, валодаючы тымі землямі, павінны былі выконваць «з них служъбу и иншие повинности, потому якъ и иншие мещане служати полнити повинни будуть» [4, арк. 9 адв. – 10, 10 адв. – 11].

4. Наконт распараджэння вымарачнай маёмасцю віцебскіх мяшчан скарга была выклікана тым, што мяшчане лічылі: ваявода «домы и маетности* таковые, которие бы по вмерлои руце, в недостатъку власного потомства, на кровные и близкие мещанъ тамошних правомъ прирожоным водле привилев ихъ приходити и спадывати мели, тым кому бы то слушъне належало непоступуючы, то на вряд замку витебского забирает и ку пожитку своему оборочает». Але віцебскі ваявода сцвярджаў, што наконт гэтага нічога не ведае, а толькі аднойчы «ижъ деи в тот часъ, гды ся тамъ у Витебъску заповетрило», дом віцебскага мешчаніна Багдана Дзянісавіча, які памер бяздзетным, «з ураду своего запечатовати казал. Акгды ся близкии оного небощика Богъдана Ходко Денисовичъ озвалъ, тогды тот домъ и всю маетъность его ему вернулъ». У сувязі з чым вялікі князь літоўскі пакінуў парадак, які быў апісаны ў прывілеях, згодна з якім ні гаспадар, ні яго віцебская замкавая адміністрацыя «в одумерсчизны уступовати се не маемъ и воленъ кождыи мещанинъ витебъскии зходечи зъ сего света домъ и всю маетъность свою при остатнеи воли своеи кому хотечи записати». Аднак, калі віцебскі мешчанін паміраў без спадкаемцаў першай чаргі («потомства» – дзецей), ці другой і т.д. чаргі («близких своих» – г.зн. родных: братоў, сястер, цётак, пляменнікаў і т.д. ) і не запісаў бы сваю маёмасць нікому тэстаментам, то маёмасць такога пераходзіла на гаспадара «праз уряд … замковыи». Дадзенае правіла адпавядала гарадскім прывілеям і нормам, якія дзейнічалі ў іншых «упривилеваных» гарадах ВКЛ [4, арк. 10, 11 адв.].

5. Віцебскіх мяшчан незадавальняла, што ваявода забараніў («заказалъ») ім ездзіць па тэрыторыі ВКЛ «для купованя живности и товаров» без свайго дазвола («без печати») ці дазволу яго намесніка [4, арк. 10 адв.], пры парушэнні дадзенай забароны мешчанамі ў іх канфіскоўвалі тавары. Незадаволенасць была выклікана тым, што «они деи не повинъни печати брати»,«того деи перед тым не бывало, одно деи хто бы за границу в землю Московскую ехал, таковым печати воеводины даваны. А такъ панъ воевода и до того се призналъ, же то под часомъ небезпечнымъ чинилъ, абы безъ печати врядовое нихто зъ замъку нигде не ездилъ». Таму

* У рашэнні манарха гаворыцца яшчэ і пра караблі-«статки» [4, арк. 11 адв.].



Репозиторий ВГУ

манарх пацвердзіў старадаўні звычай свабоднага перамяшчэння віцебскіх мяшчан па тэрыторыі сваёй дзяржавы без спецыяльных дазволаў. У сваю чаргу для паездкі за мяжу «в землю Московскую» дазвол ваяводы ці яго намесніка быў абавязковым [4, арк. 10 адв., 12 адв. – 13].

6. Мяшчане скардзіліся, што ваявода адняў у іх «померное местъское, которие они здавъна держали» и перадаў яго збор свайму прадстаўніку. Ваявода ж сцвярджаў, што так рабілі і яго папярэднікі. Войт у сваю чаргу падкрэсліваў, што той падатак з даўніх часоў горад збіраў на сваю карысць. У пацвярджэнне сваіх слоў войт клаў судовы дэкрэт па дадзенаму пытання караля польскага, вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога. Таму Жыгімонт Аугуст пастанавіў «померное местъское воитъ и мещане водлугъ стародавного обычаю, кгдыж то в привилю меновите естъ описано, на пожитокъ свои местъскии выбирати мають» [4, арк. 10, 11 адв. – 12].

7. Адносна гарадскіх рэзнікаў, мяшчане скардзіліся, што ваявода «над повинъность их» у іх загадвае браць «серодки от кожъдого быдляти забитого кухором и соколником своимъ» / «от кождого быдляти, которое на шынкъ забьют кухором своим середки яловичие и барание». Ваявода ж сцвярджаў, што, зноў жа, так рабілі яго папярэднікі. Віцебскі войт настойваў, што гарадскія рэзнікі ялавічных і бараніх серадкоў ваяводам ніколі не давалі, а толькі земскіе сакольнікі брали ў рэзнікаў ялавічныя і баранні сэрцы. У пацвярджэнне сваіх слоў войт клаў судовы дэкрэт па дадзенаму пытанню караля польскага, вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога. Абапіраючыся на дадзенае судовае рашэнне старадаўні звычай дачы віцебскімі рэзнікамі сэрцаў забітых на продаж жывёл зацвердзіў і Жыгімонт Аўгуст [4, арк. 10, 11 адв. – 12].

8. Віцебскія мяшчане сваімі прывілеямі былі вызвалены ад нясення падводнай павіннасці – «подвод давати не повинъни»; «листами привилями нашими (гаспадарскими – А.Д.) от подводъ вызволены сут»; «отдаванья подводъ … выняты суть». Але ваявода загадваў сваім слугам і каморнікамъ у іх браць коней і падводы для задавальнення транспартных паслуг замка, «за што деи им грабежи немалые поделалъ», г.зн. хто не даваў падвод, у таго забіралі пэўную маёмасць і прадавалі яе па рыначнай цане, выручаныя грошы ішлі на наём людзей, якія б выканалі неабходны аб'ём транспартных паслуг за гэтага чалавека (калі б кошт прададзенай маёмасці быў бы большым за кошт патрабуемай работы – лішак вяртаўся вінаватаму). Трэба адзначыць, што для выканання падводнай павінасці ў Віцебску існаваў спецыяльны штат людзей, «которие тои повинъности подданы», але их ваявода «до того не примушаеть».

Ваявода ў сваё апраўданне спасылаўся, што такое адбылося ў ваенны («валечъныи») час і з-за «вневедомости» ім прывілеяў мяшчан. Таму гаспадар загадаў не браць падвод у тых мяшчан, якія былі ад іх вызвалены, «одно тымъ мещаномъ, которые тои повинъности повинъни, подводы под послы нашы (гаспадарскія – А.Д.), кони давати». Неабходна адзначыць, што «вызваленыя» ад падвод віцебскія мяшчане павінны былі замест дадзенай павіннасці збіраць грошы (сума вызначалася спецыяльнай пастановай) і аддаваць у скарб ВКЛ. Дадзеныя грошы якраз і ішлі на наём падвод для гаспадарскіх паслоў і ганцоў [4, арк. 10, 13]

9. Акрамя гэтага, мяшчане паведамілі аб рабаўніцтве іх маёмасці адміністрацыяй ваяводы. Сцвярджалася, што ваявода пасылае сваіх слуг у горад, якія забіраюць «с клетеи маетъности, з шпихлеров збожъя всякие и з гуменъ сена», пры гэтым замкі адбіваюць. Акрамя гэтага ваявода безпадстаўна-«безправне домы их печатовати кажеть и по селамъ местским слугамъ своимъ приставъства роздает».

Ваявода ў сваё апраўданне сцвярджаў, што не даваў загаду «замков от клетеи и шпихлеров их отбивати, такъ же маетъностеи и збожъя их своволне брати не казал, але деи есми тых часовъ, яко велми голодных лет, слугам своим по селах местских для способеня живъности розослал былъ» и загадаў, каліхто б з яго слуг ў каго «збожя и иншых речеи стравных» узяў бы, то павінен быў «торгом заплату имъ чинити», г.зн. заплаціць за тое па рыначнаму кошту. Калі б хто не заплаціў, то ваявода гатоў быў разгледзець усе скаргі.

Нягледзячы на тое, што, у прынцыпе, дадзеная скарга мяшчан была неабгрунтаванай, гаспадар у сваім рашэнні занатаваў, што с таго часу ваявода не павінен пасылаць сваіх слуг на маёмасць мяшчан, не павінен быў бяспраўна накладваць арышт («запечатваць») на іх дамы, «такъ же тежъ лежъ и приставъствъ слугам своимъ по селах роздавати не маеть». Дадаткова ваяводзе было загадана разгледзець скаргі віцебскіх мяшчан на слуг ваяводы ў пытаннях забірання маёмасці і ў тых справах «справедливость слушную и неотволочъную водле жалобы их учинити». Пры чым разгляд спраў павінен быў праходзіць у прысутнасці спецыяльна прызначанай



Репозиторий ВГУ

даверанай асобы гаспадара па гэтаму пытанню – віцебскага войскага Марціна Курча, «которого есмо для прослуханья тых речеи тамъ до Витебъска зослали» [4, арк. 10 адв., 12–12 адв.].

Можна адзначыць, што віцебскія мяшчане адстойваючы сваю пазіцыю аперавалі да старыны, даўнасці існуючага звычая; да замацавання склаўшыйся традыцыі гаспадарчымі прывілеямі і да ранейшых дэкрэтаў манарха па аналагічных пытаннях. Прычым як прававы аргумент прымалася менавіта пісьмовая фіксацыя становішча ў прывілеях і дэкрэтах манарха. Пры разглядзе справы пазіцыя віцебскага ваяводы выглядае не агрэсіўнай, памяркоўнай – злоўжыванні ім тлумачыліся няведанем існаваўшай традыцыі ў Віцебску, не правільным разуменнем яго дзеянняў мяшчанамі, ці экстрардынарнай сітуацыяй (вайной, голадам).

Паказальна, што пры разглядзе справы не сустракаецца інфармацыя пра канфліктнасць ваяводы і мяшчан. Існавалі пытанні, якія мяшчане расцэньвалі як парушэнне сваіх правоў з боку ваяводы. Але няма нават намёка на супрацьстаянне бакоў, на нейкія радыкальныя меры, якія адбываліся б да разгляду скаргі манархам: супрацьпраўныя дзеянні мяшчан для абароны сваіх праў, дзеянні ваяводы па недапушчэнню мяшчанскіх скаргаў да манарха і інш. Наадварот, назіраецца імкненне вырашэння спрэчных пытанняў выключна ў прававым полі.

Такім чынам, дэкрэт 30 мая 1571 г. пацвярджае факты: а) удзелу віцебскіх мяшчан у замкавым судзе ў якасці судзяў; б) знаходжання віцебскага памернага ў руках гарадскога войта і мяшчан; в) валодання віцебскімі мяшчанамі землямі і маёмасцю на правах прыватнай уласнасці з гарантыяй яе неперадачы дзяржаўнай адміністрацыяй іншым асобам; г) права вольнага перамяшчэння віцебскіх мяшчан па тэрыторыі сваёй дзяржавы. Акрамя гэтага, дэкрэт змяшчае інфармацыю пра адлічэнне на карысць горада часткі перасудаў замкавага суда і пра наяўнасць асобнай гарадской турмы. А таксама сведчыць, што віцебскія мяшчане аператыўна і эфектыўна абаранялі свае правы і вольнасці, выкарыстоўваючы пры гэтым законныя сродкі барацьбы.


1. Беларускі архіў. – Т. 2. – Мінск, 1928. – С. 1–109.
2. Макараў, М. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. / М. Макараў. – Мінск : Экаперспектыва, 2008. – 248 с.
3. Макараў, М. Мейскія улады Віцебска да ўвядзення магдэбургскага права (канец 15 ст. – 1597 г.) / М. Макараў // Гістарычны альманах – 2004. – Т. 10. – С. 159–167.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. КМФ-18 (Метрыка ВКЛ). Воп. 1. Спр. 54. Арк. 9 адв. – 13 адв.
5. Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М. В. Клочко 1533–1540 гг. / Литовская метрика. Книга № 228. Книга судных дел 9 / подготовили к печати: В. А. Воронин, А. И. Груша, И. П. Старостина, А. Л. Хорошкевич. – М. : Наука, 2008. – 524 с.
6. Polski Słownik Biograficzny. – Wrocław-Warszawa-Krawów-Gdańsk, 1979. – S. 746–747.



**Веремейчик А.Е.**


## АНАЛИЗ ИСТОЧНИКОВ ОБ ИСТОРИИ ФОРМИРОВАНИЯ И ФУНКЦИОНИРОВАНИИ НЕСВИЖСКОЙ ОРДИНАЦИИ (МАЙОРАТА) РАДЗИВИЛЛОВ

В 1586 г. в результате подписания Договора между братьями Николаем Сироткой, Альбрехтом и Станиславом Радзивиллами были учреждены Несвижская, Клецкая и Олыкская ординации (майораты). Они представляли новую для Великого княжества Литовского (далее ВКЛ) форму владения и наследования недвижимости, при которой она переходила к старшему мужчине в семье и способствовала сохранению земельных владений семьи.

Крупнейшим майоратом в ВКЛ была Несвижская ординация. В ее состав вошли земельные конгломераты: Несвижское княжество, Мирское графство, имения Свержень, Миколаевщина, Могильно, – общей площадью 38 000 га. Законодательство ВКЛ гарантировало автономное развитие майоратов, что привело к организации фактически независимых от государственных структур административной и судебной систем, повлияло на изменения в правовом положении социальных групп населения, проживавших на ее территории. В публикации будет рассмотрена самая многочисленная и информативная категория источников по истории Несвижского майората – документальные материалы.

К области изучения территориального формирования ординации относятся документы о совладении имениями, представленные материалами о приобретении земель для ординации во второй половине XVI в. Документы составлялись в связи с передачей владения новому управляющему, при составлении отчетов, в ходе судебных разбирательств и во время ревизий. В большей степени их составители уделили внимание данным о площади наделов и размере на-



Репозиторий ВГУ